# Мовазнаўства

УДК [811.161.2+811.161.3]'04'246.3

*І. П. КЛІМАЎ*

## ДА ТЭОРЫІ КНІЖНА-ПІСЬМОВАЙ МОВЫ ФЕАДАЛЬНАЙ ЭПОХІ: ІМПЛЕМЕНТАЦЫЯ ТРЫНАРНАЙ МАДЭЛІ

**Резюме.** Рассматривается и обосновывается тринарная модель языковой ситуации, возможной в европейском обществе феодальной эпохи. Такая модель предполагает сосуществование двух местных идиомов, устного и письменного, с интернациональным сакральным языком (ими были, как правило, латынь или церковнославянский язык – в зависимости от региона). Развитие старобелорусского/староукраинского языка в первые столетия шло именно в соответствии с тринарной моделью. Подчеркивается близость такого пути развития западноевропейским тенденциям. В качестве особенности отмечаются черты фазового развития этого языка, что также связывается с западным влиянием.

***Ключевые слова:*** языковая ситуация; народный язык; старобелорусский/староукраинский язык; церковнославянский язык; латынь; Европа.

**Abstract.** A trinary model of the language situation, possible in an European society of the feudal era, are considered and established in the article with more details. The model supposes a coexistence of two local idioms, oral and written, together with an international sacred language (as a rule, Latin or Old Church Slavic, in regard of region). The developing Old Belarusian/Old Ukrainian language during its first centuries was namely according to the trinary model. Closeness of such developing to West European tendencies is underlined. As a specific of the evolution of the language, the features of phase development influenced by the Western tendences are observed.

***Key words:*** language situation; vernacular; Old Belarusian/Old Ukrainian; Old Church Slavic; Latin; Europe.

Сярэднявечнай Еўропе быў уласцівы падзел сфер камунікацыі на «высокія» і «нізкія»: першыя былі звязаны з кніжнасцю і пісьмом, а таксама з рэлігіяй і культам, тады як другія – з вуснай гаворкай і прафанным светам. Параўнальна з апошняй з'явай тэксты і пісьменства заўжды (па меншай ступені ў Еўропе) мелі больш высокі статус – магчыма, як больш складаныя прадукты культуры, як крыніцы духоўных вартасцей, але галоўным чынам таму, што абслугоўвалі кніжныя рэлігіі (Buchreligion), інакш – рэлігіі Святога Пісьма. У эпоху ранняга Сярэднявечча (да X–XII стст.) «высокія» і «нізкія» сферы забяспечваліся рознымі мовамі, функцыі якіх пры гэтым знаходзіліся ў дадатковай дыстрыбуцыі, калі адна мова не дапускалася да выканання функцый іншай. У выніку стваралася спецыфічнае размеркаванне моў: першая ўжывалася толькі ў адной сферы, другая – у іншай. Такая сітуацыя была блізкая да дыгласіі або з'яўлялася ёй[1].

Падобнае размеркаванне фунцый моў па сферах было тыповым для ранняга Сярэднявечча – эпохі са слабаразвітымі камунікацыямі і мінімальнай колькасцю адукаваных (а то і проста пісьменных) людзей. Тады ў «высокай» (кніжна-пісьмовай) сферы Заходняй і Цэнтральнай Еўропы ўжывалася фактычна адна мова – лацінская, якая на кантыненце засталася ў спадчыну з часоў позняй Антычнасці. Такая ж сітуацыя крыху пазней (з 2-й паловы IX ст.) усталявалася і ў большасці славян (а таксама ўсходніх раманцаў) у першыя стагоддзі існавання славянскага пісьменства, толькі замест лацінскай у іх функцыянавала царкоўнаславянская мова[2]. Гэта былі с а к р а л ь н ы я мовы (далёка не адзіныя на Еўрапейскім кантыненце)[3], што забяспечвалі функцыянаванне рэлігіі (у першую чаргу – культу), а таксама –

[1] Пры дыгласіі немагчыма выкарыстоўваць пісьмовую форму ў натуральных вусных зносінах, тады як вусная не мае нават устойлівай пісьмовай фіксацыі (гл. *Ferguson Ch.* Diglossia // Word. 1959. Vol. 15. P. 325, 327–328).

[2] Іншая назва ранняй стадыі гэтай мовы – стараславянская (гл. *Ефимова В. С.* О некоторых тенденциях развития первого литературного языка славян в произведениях древнеболгарских писателей (на материале отадъективных наречий) // Проблемы славянской диахронической социолингвистики: Динамика литературно-языковой нормы / отв. ред. Е. И. Демина. М., 1999. С. 23) – нерэлевантная для дадзенай працы і ў ёй ігнаруецца. Неістотнае значэнне (і малы абшар) мела выкарыстанне царкоўнаславянскай мовы як сакральнай у каталіцкай зоне сярод глагаляшаў (далмацінскіх харватаў). Аднак пасля заключэння ў канцы XVI – XVII стст. грэка-каталіцкіх уній ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе абшар ужытку гэтай мовы ў каталіцкай зоне пашырыўся і зрабіўся больш адметным.

[3] Да ліку сакральных, што ўжываліся ў сярэднявечнай Еўропе, адносяцца таксама арабская, старажытнаяўрэйская, армянская грабар, але іх уплыў на моўную сітуацыю ў славян ці на развіццё славянскіх моў адсутнічае або нязначны. Большай была роля грэчаскай мовы, аднак за межамі Візантыі і сумежных з ёй краін на Балканах веданне гэтай мовы было слабым, а ўплыў адбываўся пераважна апасродкавана (праз іншыя сакральныя мовы – царкоўнаславянскую, лацінскую).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па неабходнасці – і многія іншыя сферы пісьмовай і асабліва кніжнай камунікацыі. Аднак гэта былі ў многім і чужынныя або няясныя мовы, малазразумелыя ці нават зусім незразумелыя народам, што імі карысталіся. Так, лацінская мова страціла натуральнае носьбіцтва ў сваёй вуснай форме на пачатку IX ст., калі сталі складвацца асобныя раманскія мовы [1, S. 47–49]; царкоўнаславянская ж мова наогул ніколі не мела такога носьбіцтва або адразу яго згубіла пасля свайго ўзнікнення [2, с. 49, сноска 6, 143–144]. Лацінская і царкоўнаславянская сакральныя мовы (параўнанне іх функцый гл. [3]) існавалі ўвогуле асобна адна ад адной і звычайна адна з іх не дапускалася да ўжытку замест іншай (па экстралінгвістычных прычынах), хаця пэўныя выключэнні меліся і тут[1]. Аднак у памежных рэгіёнах сферы функцыянавання лацінскай і царкоўнаславянскай моў геаграфічна супадалі (накладаліся). Адным з такіх рэгіёнаў была тэрыторыя Беларусі і Украіны, што ўтварае яе выразную культурна-рэлігійную спецыфіку.

Сакральныя мовы мелі граматыкі і слоўнікі (далёка не абавязкова)[2], багатую літаратуру (у асноўным рэлігійную), ужываліся ў прэстыжных сферах камунікацыі – перш за ўсё ў рэлігіі (для культу і часта – для рэлігійнай прапаганды і ўнутрыцаркоўных зносін), нярэдка ў заканадаўстве і адміністрацыі, адукацыі, навуцы і мастацкай літаратуры (наколькі апошнія дапускаліся клерыкальным характарам сярэднявечнай Еўропы), пры дыпламатычных (міжнародных) зносінах. Зона іх распаўсюджання ахоплівала шмат краін і народаў; фактычна гэта былі інтэрнацыянальныя мовы свайго часу. Аднак яны не былі роднымі ні для якога народа (хаця часткова маглі быць зразумелымі – як латынь для народаў раманскага маўлення ці царкоўнаславяншчына для паўднёвых славян) і фактычна з'яўляліся мёртвымі ці штучнымі мовамі [2, с. 35, 48, сноска 3, 49, сноска 5], чыё існаванне падтрымлівалася калектыўнымі высілкамі і пры дапамозе вельмі ўплывовых структур, такіх як царква і дзяржава [1, S. 75]. З гэтай прычыны веданне сакральнай мовы ў эпоху Сярэднявечча канцэнтравалася ў пэўных карпарацыях (святары, манахі, юрысты, пісары (канцылярысты), настаўнікі, вучоныя і інш.)[3]. Асноўная частка насельніцтва не валодала сакральнай мовай і пры патрэбе звярталася да паслуг прадстаўнікоў такіх карпарацый. Карпарацыі культывавалі сакральную мову дзеля сваіх прафесійных мэт (культ, адміністрацыя, суд, дыпламатычныя зносіны і да т. п.) і маглі падтрымліваць яе веданне доўгі час пасля таго, як такая мова выходзіла з жывога ўжытку. Аднак гэта былі вельмі вузкія колы, сацыяльна адасобленыя ад астатняга грамадства.

Спецыфіка функцыянавання сакральнай мовы ў эпоху ранняга Сярэднявечча, відаць, у тым, што «высокая» сфера зносін ахоплівала не толькі рэлігію, але адукацыю і літаратуру (кніжнасць), а таксама адміністрацыю і права – сферы, далёкія ад сакральнасці, а то і зусім прафанныя. У такім выпадку сакральная мова фактычна ўжывалася ў неўласцівых ёй несакральных функцыях. Відаць, менавіта гэта неадпаведнасць і прывяла да істотных змен у моўнай сітуацыі, калі ў эпоху позняга Сярэднявечча з ростам гарадоў і складваннем цэнтралізаваных дзяржаў з'явілася патрэба ва ўсё больш інтэнсіўнай і шырокай пісьмовай камунікацыі, прычым у свецкай сферы. Сакральная мова з яе вузкай сацыяльнай базай і складаным, працаглым (часта нават індывідуальным) механізмам авалодання ўжо больш не магла выконваць значна ўзрослыя функцыі ў неўласцівай ёй свецкай сферы. Камунікацыя ў познім сярэднявечным грамадстве зрабілася больш складанай, каб адназначна падзяляцца бінарна на пісьмовую і вусную мовы, як гэта было раней.

Выйсце было знойдзена ў стварэнні мовы з шырокай сацыяльнай базай і арыентаванай на абслугоўванне менавіта свецкіх зносін. Такой мовай стала народная кніжна-пісьмовая, якая пераўтварыла ранейшую бінарную мадэль у трынарную: ранейшая дыгласія разбурылася на карысць трохмоўя з народнай мовай у якасці новага кніжна-пісьмовага ідыёма [4]. У Заходняй Еўропе гэты працэс пачаўся ў эпоху высокага і позняга Сярэднявечча, у XI–XIII стст., у залежнасці ад рэгіёна [5, с. 43–45].

[1] Такія выключэнні да XVI ст. былі абумоўлены або гістарычнымі (харвата-глаголічны рытуал у Далмацыі), або палітычнымі фактарамі. Так, IV Латэранскі сабор 1215 г. дазволіў грэчаскую літургію, што было зроблена хутчэй у разліку на падпарадкаванне Рыму італьянскіх і сіцылійскіх грэкаў, а таксама насельніцтва Візантыі і Леванта, захопленых тады крыжакамі (гл. *Richter M.* Kommunikationsprobleme in lateinischen Mittelalters // Historische Zeitschrift. 1976. Bd. 222. Hf. 1. S. 52–53). Можна згадаць і грэчаскую літургію на Русі, што аказіянальна ўжывалася мітрапалітамі ці біскупамі грэчаскага паходжання (гл. *Успенский Б. А.* История русского литературного языка (XI–XVII). [3-е изд.] М., 2002. С. 53–54). Ва ўсіх падобных выпадках справа ідзе пра выкарыстанне адной сакральнай мовы замест іншай, але зусім не пра ўжытак народнай.

[2] Толькі грэчаская і лацінская мовы мелі слоўнікі і граматыкі з часоў Антычнасці, значна пазней іх атрымалі грабар і арабская, а царкоўнаславянская набыла зусім позна (з канца XVI ст.). У ёй гэта было здзейснена больш пад заходнееўрапейскім уплывам, тады як у самой мове востарай неабходнасці ў граматычным унармаванні не ўзнікала. Яна была спецыяльна створана для культавай функцыі, тады як грэчаская і латынь – толькі прыстасаваныя да яе (гл. *Успенский Б. А.* История русского литературного языка (XI–XVII). [3-е изд.] М., 2002. С. 30). Адсутнасць ці няпоўнасць кадыфікацыі не перашкаджала авалоданню царкоўнаславянскай мовай: у ёй меліся пэўныя фармальныя правілы (нормы), якім вучыліся на аўтарытэтных узорах і/ці пад кіраўніцтвам кваліфікаванага інструктара (гл. *Ефимова В. С.* О некоторых тенденциях развития первого литературного языка славян в произведениях древнеболгарских писателей (на материале отадъективных наречий) // Проблемы славянской диахронической социолингвистики: Динамика литературно-языковой нормы / отв. ред. Е. И. Демина. М., 1999. С. 26–27). Таму адно авалоданне такімі мовамі ўжо давала пэўную адукацыю (гл. *Richter M.* Kommunikationsprobleme in lateinischen Mittelalters // Historische Zeitschrift. 1976. Bd. 222. Hf. 1. S. 78–80), а сама адукацыя ў эпоху Сярэднявечча разглядалася як веданне сакральнай мовы (Ibid. S. 60–61). Толькі Роджар Бэкан упершыню вывеў, што сакральная мова не дае сапраўднай адукацыі (sapiencia), а толькі лепшую тэхнічную падрыхтоўку (Ibid. S. 78).

[3] Карпарацыйны характар валодання сакральнай мовай рэштках бачны і зараз на прыкладзе латыні, што ўжываецца сярод лекараў разам з фармацэўтамі, юрыстаў (у краінах з сістэмай рымскага права), тэолагаў (пераважна каталіцкіх), батанікаў і заолагаў. Карпарацыя дазваляла знаўцам сакральнай мовы працаваць у розных мясцовасцях і краінах незалежна ад свайго паходжання (і сваёй роднай мовы).

У выніку ў моўную сітуацыю дадаўся трэці кампанент, а ў «высокай» сферы пачалі функцыянаваць дзве мовы: сакральная і народная кніжна-пісьмовая. Апошняя заўжды саступала ў вартасці і годнасці першай, была генетычна «нізкай», але паступова набірала сабе ўсё больш і больш прэстыжу – па меры таго, як адбірала ў сакральнай ранейшыя сферы і функцыі. Гэты працэс у розных еўрапейскіх народаў, у розных кутках Еўропы праходзіў не адначасова, з рознай хуткасцю, аднак даволі няўхільна, ахопліваючы ў розныя часы пэўныя сферы (прыдворнае жыццё, адміністрацыя і справаводства, школа і асвета, навука і нават рэлігія) ці пэўныя групы жанраў: гераічныя эпасы, куртуазныя паэмы і песні, рыцарскія раманы, хронікі ці летапісы, юрыдычныя акты і кодэксы і г. д. [5, с. 43]. Перафразуючы вядомы выраз, можна сказаць, што панаванне сакральнай мовы скончылася тады, калі на народнай мове можна было выразіць усе тыя духоўныя вартасці, якія існавалі раней на сакральнай [1, S. 50]. Аднак пры ўсіх камунікацыйных стратах сакральная мова – і лаціна на Захадзе, і царкоўнаславяншчына ў Slavia Orthodoxa – заставалася моцным культурным сімвалам, які да XIX ст. захоўваў свой прэстыж і ўплыў.

«Нізкая» кніжна-пісьмовая мова тут называецца н а р о д н а й (Volkssprache), але «народ» (populus) у гэтым выпадку трэба разумець даволі вузка – як эліты таго ці іншага народа (этнасу), якія, праўда, маглі атаясамліваць сябе з усім народам (параўн. «лепшыя людзі» ці «першыя мужы»)[1]. Асновай для ўтварэння народнай мовы станавіліся пануючыя класы [2, с. 42]. Маўленне (адпаведна і пісьмовы дыскурс) такіх эліт не заўжды было размоўна-гутарковым, тоесным з маўленнем ніжэйшых класаў, а больш адрозным, адметным (aristocrato, dotto). Часта гэта маўленне зазнавала ўплыў сакральнай, «высокай» мовы ці іншай (звычайна суседняй) больш прэстыжнай народнай мовы (напрыклад, у выпадку Беларусі і Украіны – польскай). Аднак у цэлым (пры пэўнай дыстанцыі) такое маўленне эліт можна ўсё ж прызнаваць народным – у тым сэнсе, што яно адлюстроўвае асноўныя рысы, уласцівыя агульнанароднай (этнічнай) мове (Ethnosprache). Адпаведна і кніжна-пісьмовая мова, што паўставала на падставе такога маўлення, таксама можа быць прызнана (хаця і з пэўнай умоўнасцю) народнай. Яна першапачаткова была заснавана на дыялекце пэўнага этнасу ці на групоўцы роднасных дыялектаў. На практыцы такая народная кніжна-пісьмовая мова нярэдка ўяўляла сабой мяшанае (гібрыднае?) утварэнне, спалучаючы элементы і «высокай» мовы, і «нізкай» гаворкі, і ўласнага маўлення эліт, у пісьме – кніжныя элементы і гутарковыя (апошнія былі часта наддыялектнымі, хаця маглі трапляцца і вузкадыялектныя). У любым выпадку, функцыянуючы ў пісьменстве, народна-пісьмовая мова развівалася пад уплывам «высокай» мовы (часам нават некалькіх), а таксама іншых (ужо існуючых) народна-пісьмовых моў, з якімі яна мела найбольш інтэнсіўныя кантакты. Пры гэтым кадыфікацыі «нізкай» кніжна-пісьмовай мовы не было зусім ці яна праводзілася даволі позна або толькі часткова.

У выніку ў эпоху позняга Сярэднявечча ў пісьменстве існавалі ўжо дзве кніжна-пісьмовыя мовы: «высокая», якая абслугоўвала рэлігію і царкву, – сакральная, і «нізкая», якая гэтыя вобласці не абслугоўвала, – народная. Яны адрозніваліся паводле культурнага зместу сваіх функцый – як сакральнае і прафаннае (sacro vs. profano), а таксама паводле геаграфічнай рэпрэзентацыі – як інтэрнацыянальнае і нацыянальнае (universale vs. nationale). У выніку кніжна-пісьмовыя мовы сярэднявечнага грамадства падзяляліся на сакральныя (lingua sacra) і свецкія (lingua popularis/lingua vulgaris – напачатку так называліся формы размоўнай латыні), першыя былі інтэрнацыянальнымі, а другія, як правіла, – нацыянальнымі (часам – супранацыянальнымі, калі ўжываліся ў некалькіх суседніх ці роднасных народаў). Аднак абедзве яны былі кніжна-пісьмовымі, абедзвюм трэба было вучыцца, іх веданне ўжо ствärала пэўны кшталт адукацыі. Іншая справа, што змест і характар навучання кожнай былі розныя: школа, фармальныя правілы і агульнапрызнаныя ўзоры ў першым выпадку або інтуітыўныя ўяўленні, практыка (навык) і стыхійна прэцэдэнтныя тэксты (часта толькі рэгіянальна) у другім. Рознымі былі таксама і функцыі ў моў. «Высокая» сакральная мова была выключна звязана з пісьмом (часта без істотнай ролі вуснай гаворкі, з кніжнай ці ўмоўнай арфаэпіяй): культ, царква, адукацыя і навука, часткова права (рымскае); «нізкая» мова хаця і набывала пісьмовую фіксацыю, а затым і кніжную традыцыю, аднак спачатку была заснавана на вуснай практыцы, дзе пісьмовая фіксацыя выконвала толькі другасную ролю: права (мясцовае, звычаёвае) і публічны суд, дыпламатыя, гандаль, катэхізацыя і місіянерства [6, с. 3–4][2].

---

[1] Даўняе разуменне народа (у сацыяльным аспекце) адрозніваецца ад сучаснага. Напрыклад, у прававой думцы Рэчы Паспалітай з 2-й паловы XVI ст. народам (populus) лічыліся пануючыя колы грамадства, перш за ўсё шляхта і духавенства, за выключэннем няшляхты і неправаздольных (гл. *Grzybowski K.* Ojczyzna. Naród. Państwo. [2-e wyd.] Warszawa, 1977. S. 58–59). Тое ж бачна і ў знакамітым *We, the people* Канстытуцыі ЗША 1787 г., якое юрыдычна не ахоплівала ні беднякоў (не кажучы ўжо пра рабоў і індзейцаў), ні жанчын, ні моладзь. Такім чынам, да народа з пачаткам Новага часу адносіліся колы, што мелі сацыяльна прывілеяванае становішча ці трывалы матэрыяльны грунт (сталы даход і/ці ўласнасць), напрыклад, у Новым Свеце імі з'яўлялася і заможнае мяшчанства. Астатнія колы грамадства, хаця і шматлікія, але сацыяльна бяспраўныя ці непаўнапраўныя і эканамічна незаможныя, з народа, як правіла, выключаліся, лічыліся перыферыяй грамадства, маргіналамі (плебсам, чэрню, простанароддзем). Таму народ у разуменні рамантыкаў і народ у трактатах рэнесансных гуманістаў XV–XVI стст., як і асветнікаў XVIII ст., пазначалі розныя сацыяльныя аб'екты, якія нельга блытаць.

[2] Варта адзначыць першапачатковы ўдзел ляікаў у некаторых царкоўных рытуалах кшталту хрышчэння ці вянчання (гл. *Richter M.* Kommunikationsprobleme in lateinischen Mittelalters // Historische Zeitschrift. 1976. Bd. 222. Hf. 1. S. 55). Таксама споведзь і пакаянне заўжды прымаліся на народнай мове, што нават патрабавалася царкоўнымі актамі (Ibid. S. 55–56, 71). У каталіцкім свеце з часоў каралінгскіх сінодаў IX ст. некаторыя малітвы і сімвал веры маглі перакладацца на размоўную мову для разумення свецкага насельніцтва (гл. *Richter M.* Die Sprachenpolitik Karls des Grossen // Sprachwissenschaft. 1982. Bd. 7. Hf. 3–4. S. 412–437.). З таго ж часу было дазволена і sermo vulgaris – казанне на народнай мове (гл. *Richter M.* Kommunikationsprobleme in lateinischen Mittelalters // Historische Zeitschrift. 1976. Bd. 222. Hf. 1. S. 56–62, 66–70), як і спяванне секвенцый (Ibid. S. 56, Anmerkung 36). Таксама і місіянерства адбывалася на народнай мове, што прадугледжвала пераклад на яе асноўных малітваў, сімвала веры, формул некаторых сакрамантаў, часам нават рэлігійных песень, якія мусілі выцесніць мясцовыя паганскія (Ibid. S. 59–61). Аднак гэта ўсё былі вусныя формы камунікацыі, якія толькі аказіянальна траплялі ў пісьмо.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Народныя кніжна-пісьмовыя мовы мелі лакальны ўжытак і абслугоўвалі зносіны пераважна аднаго народа ці групы роднасных народаў (дыялектаў). У Еўропе яны ўзніклі даволі рана, ужо ў перыяд развітага Сярэднявечча. У X–XV стст. (ад каралінгскага Адраджэння да італьянскага) іх можна налічыць даволі шмат: англасаксонская, правансальская, верхне- і ніжненямецкая, італьянская, французская, іспанская, каталонская, галісійска-партугальская, ірландская, нарвежская, шведская, дацкая, ісландская, а са славянскіх – гэта чэшская, харватасербская/сербахарвацкая (не толькі ў Далмацыі, але ў Сербіі і Босніі) і «руськая» (старабеларуская/стараўкраінская, супольная для даўніх беларусаў і ўкраінцаў). У большасці выпадкаў усе гэтыя народныя мовы развіваліся пад «дахам» сакральных моў (лацінскай і толькі дзве апошнія – харватасербская і «руськая» – пад царкоўнаславянскай), але нярэдка зазнавалі ўплывы сваіх больш паспяховых суседзяў – іншых народных моў.

У сваёй пісьмовай функцыі абедзве гэтыя кніжна-пісьмовыя мовы – сакральная і народная – супрацьпастаўляліся ўжо іншай – (і н т э р) д ы я л е к т н а й, жывой гаворцы (locutio vulgaris, vulgare eloquium, sermo rusticus і да т. п.), якая ў пісьмо (фактычна да Новага часу) ніколі не траплала ці траплала аказіянальна; гэта была ўласна гаворка, гутарка, маўленне. Гэта маўленне засвойвалі дзеці без усялякіх правіл і школы ад маці ці нянькі (слуг), ад сваіх родзічаў і суседскага атачэння. Тут праходзіў падзел паміж пісьмовай і вуснай мовай (scritto vs. orale). З гэтага вынікае, што неабходна ўвесці падзел «нізкай» сферы на дзве падсферы – вусную і пісьмовую. Такім чынам, «нізкая» сфера камунікацыі ў эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу была прадстаўлена не адной, а дзвюма мовамі: «нізкай» пісьмовай і «нізкай» вуснай. Першая абслугоўвала свецкую камунікацыю ў пісьмовай сферы: права (апрача царкоўнага), суд (каралеўскі ці княжацкі), дыпламатыю, гандаль – усё, што было заснавана на вусным маўленні. Другая «нізкая» мова – вусны ідыём (дыялект ці інтэрдыялект), які засвойваўся аўтаматычна, ад нараджэння, – зусім не дапускалася ў пісьмовую сферу, лічылася неапрацаванай, грубай, вульгарнай (rustico), у некаторых выпадках – нават звязанай з маўленнем толькі нізоў (populare). Яна магла пранікнуць у пісьменства толькі ў выглядзе памылак ці адхіленняў.

Хаця народная кніжна-пісьмовая мова паступова выцесніла сакральную мову ў вузка ці пераважна рэлігійную сферу, сваёй экспансіі яна на гэтым не спыніла. Паступова народная мова (першапачаткова – дыялектны ідыём, звязаны з вусным маўленнем) пачала пранікаць і ў сферу рэлігійнай камунікацыі – натуральны domain сакральнай мовы. Сапраўды, нават у феадальным грамадстве «высокія» сферы, звязаныя з рэлігіяй, не маглі доўга заставацца без выкладу (ці перакладу) на зразумелую мову (напачатку – вусную). Трэба было тлумачыць вернікам сэнс і змест літургіі, Святога Пісьма, царкоўных вучэнняў і прадпісанняў, цудаў святых і іх рэліквій, вучыць дзяцей пісьму і чытанню (звычайна на падставе рэлігійных кніг і з мэтай дасягнення іх). Менавіта дзеля гэтых патрэб стала выкарыстоўвацца народная мова, першапачаткова ў значнай ступені дубліруючы (за кошт перакладаў) тэксты і функцыі сакральнай. Таму пэўны час многія жанры і нават творы існавалі ці развіваліся паралельна – на сакральнай і на народнай мовах, у сувязі з чым некаторыя даследчыкі гавораць пра моўны дуалізм [1, S. 43–44]. Працэс пранікнення народнай мовы ў пісьменства адбываўся пакрысе, рознымі шляхамі (напрыклад, шляхам гібрыдызацыі ці макаранізацыі) і праз перыферыйныя ці другаступенныя жанры: малітвы, павучанні, рэлігійныя песні і апавяданні; глосы, фразы ці запісы на палях рэлігійных кніг і актаў, фрагменты ў рэлігійных творах (напрыклад, містэрыях), рэлігійныя кантэксты ў мастацкай літаратуры (хроніках, гісторыях, навелах, раманах, пародыях). Рэлігійнае пісьменства многіх народных моў сярэднявечнай Еўропы пачыналася менавіта з такіх сціплых запісаў і фіксацый, мяшаных тэкстаў, перыферыйных жанраў.

У развіцці народных кніжна-пісьмовых моў сферы Pax Latina на ранніх стадыях можна заўважыць некаторую ф а з а в а с ц ь, калі народная мова пранікае не адразу ў розныя сферы пісьменства, а толькі ў пэўныя яго галіны, ахоплівае толькі пэўную сістэму жанраў: мастацкую літаратуру (эпасы, гістарычныя хронікі, раманы, паэмы, песні), актава-юрыдычнае пісьменства (акты і кодэксы права), рэлігійную літаратуру (малітвы, рэлігійныя песні, жыцці, казанні), навукова-вучэбную літаратуру (слоўнікі, граматыкі, прыточнікі, падручнікі, кіраўніцтвы) і г. д. У розных заходнееўрапейскіх краінах развіццё народнай мовы адбывалася ў той ці іншай паслядоўнасці (напачатку мастацкая або рэлігійная літаратура і затым актава-юрыдычнае пісьменства або напачатку актава-юрыдычнае пісьменства і затым рэлігійная літаратура, а ўжо потым мастацкая і г. д.), аднак, здаецца, нідзе не пачыналася адначасова ў розных сферах, галінах ці жанрах, нават выпадкова ці адзінкава[1]. Часта з моманту распаўсюджання народнай мовы ў адной сферы мінала некалькі стагоддзяў ці дзесяцігоддзяў, перш чым яна пачынала распаўсюджвацца ў другой. Прычынай такога фазавага пераходу звычайна служылі розныя экстралінгвістычныя фактары (анексія, унія, заснаванне дзяржавы ці дынастыі, рэформа, завядзенне канцылярыі або скрыпторыя, друкарні і да т. п.). Яны заўжды рабілі значны ўплыў на такую сацыяльна значную з'яву, як кніжна-пісьмовая мова. Такая мова для свайго развіцця заўсёды патрабуе той ці іншай акцэптацыі з боку ўлад, легалізацыі ў сістэме нормаў і вартасцей, прызнання з боку грамадства, яго асобных груп (што неістотна для вуснага маўлення).

Фазавы характар развіцця народных кніжна-пісьмовых моў Заходняй і Цэнтральнай Еўропы эпохі Сярэднявечча рэдка заўважаецца, але ён добра бачны пры параўнанні з гісторыяй моў у сферы

[1] Помнікі з больш ранняга часу захоўваюцца ў меншай ступені. Аднак калі з пэўнай эпохі вядомы помнікі толькі аднаго жанру і зусім няма помнікаў іншых жанраў, то справа тут, хутчэй за ўсё, не ў іх захаванасці, а ў тым, што тады помнікаў у гэтых жанрах яшчэ не было.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУ

Slavia Orthodoxa. Там на ранніх стадыях развіцця вялікае значэнне мела паступовая гібрыдызацыя ці інфільтрацыя народных славянскіх элементаў у царкоўнаславянскія тэксты [7, с. 15–16, 18, 20] – свайго роду іх «вульгарызацыя», як гэта адбывалася з латынню. Але на Захадзе заслону гэтаму працэсу паставілі рашэнні каралінгскіх сінодаў, што патрабавалі не прыстасоўваць літургічнае вымаўленне да мясцовай раманскай гаворкі [8]. На Усходзе, у славян, заслона такому працэсу не была пастаўлена, і таму царкоўнаславянская мова актыўна прымала ў свой склад элементы народных славянскіх дыялектаў [2, с. 46, 132–133]. Нават зараз блізкароднасныя мовы, паводле назірання А. Марцінэ, успрымаюцца як моцна адрозныя варыянты адна адной і не патрабуюць перакладчыка [9, p. viii]. Тым больш у раннюю эпоху пераклад з аднаго славянскага дыялекта на другі фактычна адсутнічаў ці быў немагчымы з прычыны блізкасці славянскіх дыялектаў [2, с. 130, 143]. Тое ж справядліва і для германскіх моў, па меншай ступені ў нямецкім арэале [10], і для раманскіх [11, p. 181] – там унутры сваёй групы роднасных дыялектаў існавала ўзаемаразуменне і перакладчык быў не патрэбны. Таму і гісторыя «руськай» мовы можа разглядацца ў аспекце паступовага і непарыўнага развіцця [12, с. 80–91; 13, с. 127–128]. Пры ўсёй слушнасці такога падыходу ў гісторыі «руськай» мовы, аднак, можна заўважыць і іншую тэндэнцыю – фазавасць, калі яна набывала пэўныя рысы і/ці атрымлівала пашырэнне толькі з нейкага моманту ці ў нейкай сферы (жанры). Можна меркаваць, што важную ролю ў такім «фазавым пераходзе» адыгрывалі пераклады [14].

Калі звярнуцца да гісторыі «руськай» мовы, то і ў ёй можна заўважыць элементы фазавага развіцця, прычым ужо на ранніх этапах.

У першыя дзесяцігоддзі ці стагоддзі свайго існавання народныя кніжна-пісьмовыя мовы Pax Latina заўжды мелі вельмі сціплае пісьменства і толькі пачаткі літаратурнай свецкай традыцыі. Гэта добра бачна і ў гісторыі «руськай» мовы, якая ў XIV–XV стст. функцыянавала выключна (ці амаль выключна) як актавая мова [13, с. 129–138; 12, с. 93–100] і не мела ўжытку ні ў царкоўнай сферы, ні ў літаратуры, ні ў асвеце [15, с. 35, 38, 58–59]. Тады яна выкарыстоўвалася для судовых, адміністрацыйных і гандлёвых актаў, потым – таксама ў юрыдычных кодэксах.

Аднак з цягам часу функцыі народных моў Pax Latina пашыраліся за кошт перакладаў (з сакральнай мовы ці іншых, больш развітых народных моў), хаця нярэдка толькі ў перыферыйных жанрах. Такія пераклады (яны маглі быць і пераказамі, і апрацоўкамі) дубліравалі сакральныя і іншыя рэлігійныя тэксты. У выніку на народнай мове з'яўляецца выхаваўчая, павучальная, забаўляльная літаратура (жыцці святых, пераказы біблейных гісторый і легенд, рэлігійныя навелы і раманы). Гэта таксама назіраецца ў гісторыі «руськай» мовы – з сярэдзіны ці канца XV ст. (што, магчыма, звязана са здабыццём аўтаноміі Кіеўскай метраполіяй, калі ў ёй пачынаецца пастаўленне мітрапалітаў (ад 1475 г.) з ліку падданых ВКЛ). Прыкладна з таго часу на гэтай мове вядомы пераклады (у асноўным з заходнееўрапейскіх крыніц) рыцарскіх раманаў («Александрыя», «Троя»), рэлігійных аповесцей («Пакуты Хрыстовы», «Аповесць аб трох вешчунах», «Жыцце Аляксея, чалавека божага»), нават логіка-філасофскіх трактатаў («Арыстоцелевыя вароты», «Логіка», «Шастакрыл», «Касмаграфія» і інш.) і біблейных кніг (пераважна найбольш апавядальных і займальных частак Старога Запавету) [15, с. 73–79, 89–113]. Перакладчыкі ўсіх гэтых твораў у большасці выпадкаў невядомы, хаця ў 1-й палове XVI ст. становяцца вядомымі і яны, нават актыўна маніфестуючы свой перакладчыцкі занятак (напрыклад, Ф. Скарына). Бадай адзіным буйным жанрам, дзе адметна ў гэты час ужывалася «руськая» мова, становіцца летапісанне, у якім, праўда, здаўна выкарыстоўвалася царкоўнаславянская мова [16, с. 42–48, 83]. Пранікненне «руськай» мовы ў гэты жанр пачалося, верагодна, ужо ў 1-й палове XV ст., але адбывалася пераважна шляхам гібрыдызацыі, за кошт змяшэння ўсходне- і царкоўнаславянскіх элементаў [12, с. 108–115; 15, с. 59–72]. Аналагічнае змяшэнне рознаславянскіх элементаў (з дадаткам заходнеславянскіх) можна знайсці і ў выданнях Ф. Скарыны 1517–1525 гг. [12, с. 120–127; 15, с. 120–157]. Такі кірунак развіцця ўласцівы мовам у сферы Slavia Orthodoxa, яго можна назваць традыцыйным.

Наступным па часе важным этапам развіцця народных кніжна-пісьмовых моў на Еўрапейскім кантыненце сталі Рэнесанс і Рэфармацыя (пачатыя ў той перыяд тэндэнцыі дзейнічалі і пазней, у эпоху барока). Гуманізм і рэлігійны рэфармізм моцна паспрыялі пашырэнню функцый народнай кніжна-пісьмовай мовы ў грамадстве, яе больш дасканалай апрацоўцы ў літаратурных творах. У гэты час пры захаванні традыцыйнай тэндэнцыі да гібрыдызацыі мовы (існуючых царкоўнаславянскіх твораў пры іх перапісцы) актывізуецца практыка перакладаў, як і стварэнне арыгінальных твораў. «Руськая» мова пранікла амаль ва ўсе сферы літаратурна-пісьмовай камунікацыі грамадства (у тым ліку і ў рэлігійную сферу), стала даволі дасканалым сродкам зносін свайго часу. Нездарма перыяд 2-й паловы XVI – 1-й паловы XVII ст. (ва Украіне – гэта хутчэй XVII ст.) называюць «залатым векам» «руськай» мовы, эпохай яе росквіту.

Далейшыя шляхі развіцця народных кніжна-пісьмовых моў Заходняй і Цэнтральнай Еўропы вялі да ўтварэння на іх базе нацыянальных літаратурных моў, аднак шляхі «руськай» мовы ў гэтым кірунку атрымаліся больш складанымі, што заслугоўвае асобнага разгляду. Пакуль жа трэба канстатаваць, што складванне і развіццё «руськай» мовы ў XIV–XVI стст. адбывалася менавіта ў рэчышчы трынарнай мадэлі, калі ўзаемадзеянне ішло, з аднаго боку, з сакральнай царкоўнаславянскай (рэдка – лацінскай), а з другога – з беларускімі і ўкраінскімі дыялектамі. Іншая выснова, якую трэба зрабіць з праведзенага аналізу, – развіццё «руськай» мовы рана падпала пад дзеянне заходнееўрапейскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэндэнцый. Гэта праявілася ў XIV–XVI стст. у пэўнай фазавасці – распаўсюджанні «руськай» мовы з пэўнага моманту, у пэўных сферах ці жанрах пісьменства, што выглядае крыху парадаксальна, улічваючы арганічную сувязь «руськай» мовы з царкоўнаславянскай (ад якой ёй дасталася кірылічная графіка і рэлігійная ды абстрактная лексіка), а таксама генезіс «руськай» мовы ў сферы Slavia Orthodoxa. Відаць, заходнія ўплывы зрабілі моцны ўплыў на гісторыю гэтай мовы ўжо на ранніх стадыях яе існавання.

### БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. *Richter M.* Kommunikationsprobleme in lateinischen Mittelalters // Historische Zeitschrift. 1976. Bd. 222. Hf. 1. S. 43–80.
2. *Толстой Н. И.* История и структура славянских литературных языков / отв. ред. В. Н. Ярцева. М., 1988.
3. *Keipert H.* Kirchenslavisch und Latein: Über die Vergleichbarkeit zweier mittelalterlicher Kultursprachen // Sprache und Literatur Altrußlands: Aufsatzsammlung / Hrsg. G. Birkfellner. Münster, 1987. S. 81–109.
4. *Клімаў І. П.* Да тэорыі кніжна-пісьмовай мовы феадальнай эпохі: бінарная мадэль vs. трынарная мадэль // Весн. БДУ. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. 2014. № 3. С. 12–16.
5. *Жирмунский В.* Национальный язык и социальные диалекты. Л., 1936.
6. *Зееман К. Д.* Двуезичие («диглоссия») и система на езикова комуникация в Древна Русия // Език и литература. 1984. № 5. С. 1–6.
7. *Толстой Н. И.* Древнеславянский литературный язык в XII–XIV вв. (его функции и специфика) // Развитие этнического самосознания славянских народов в эпоху зрелого феодализма / отв. ред. Г. Г. Литаврин, В. В. Иванов. М., 1989. С. 14–24.
8. *Richter M.* Die Sprachenpolitik Karls des Grossen // Sprachwissenschaft. 1982. Bd. 7. Hf. 3–4. S. 412–437.
9. *Weinreich U.* Languages in contact: Findings and problems [photomechan. offprint: New York, 1953]. The Hague ; Paris, 1970.
10. *Moulton W. G.* Mutual intelligibility among speakers of Early Germanic dialects // Germania: Comparative studies in the Old Germanic language and literatures / eds. D. G. Calder, T. C. Christy. Woodbridge, 1988. P. 9–28.
11. *Wright R.* A sociophilological study of Late Latin. Turnhout, 2002.
12. *Шакун Л. М.* Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. Мінск, 1963.
13. *Плющ П. П.* Нариси з історії української літературної мови. Київ, 1958.
14. *Клімаў І. П.* Пераклад і перакладная мова ў даўнім пісьменстве беларусаў і украінцаў // Весн. БДУ. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. 2014. № 1. С. 47–54.
15. *Жураўскі А. І.* Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. Мінск, 1967. Т. 1.
16. *Клімаў І. П.* Старажытная беларуская літаратура XI–XVI стст.: Эпохі і постаці. Мінск, 2010.


Паступіў у рэдакцыю 27.11.2014

***Ігар Паўлавіч Клімаў*** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

*УДК 81-114.2*

*Н. А. СНИГИР*

## НАЧИНАТЕЛЬНЫЙ СПОСОБ ДЕЙСТВИЯ В БЕЛОРУССКОМ И СЕРБСКОМ ЯЗЫКАХ: ОБЩЕЕ И СПЕЦИФИЧЕСКОЕ

**Резюме.** Рассмотрен один из видов акциональной семантики белорусского и сербского языков – начинательный способ действия. На основе ряда признаков (морфемный состав, лексическое значение, вид, переходность/непереходность глаголов) и контекстов сопоставлены составы свойств этого способа действия в указанных языках. В белорусском и сербском как в языках одной генеалогической группы языков общими являются основные признаки способа действия. К ним относим наличие данного способа (и, как безусловное следствие, лексическое значение глаголов этого способа), перфективацию при образовании глагола начинательного способа, отсутствие специальных обязательных лексических показателей, пересечение соответствующих подзначений префиксов в языках. Специфическими же представляются периферийные признаки, указывающие на своеобразие систем близкородственных языков. К ним относятся отличия между наборами формантов, различия лексических значений мотивирующих глаголов, частота вторичной имперфективации. Более того, использованная схема анализа и сравнения может применяться для исследования всех способов действия в белорусском и сербском языках.

***Ключевые слова:*** способ действия; начинательный способ действия; глагол; префикс; лексическое значение; вид; переходность; формант.

**Abstract.** One of the kinds of actional semantics in Belarusian and Serbian – inchoative manner of action – is considered in the article. On the basis of a number of criteria (morphemic structure, lexical meaning, aspect, transitivity/intransitivity of verbs) and contexts are compared the compositions of characteristics of this manner of action in these languages. In Belarusian and Serbian as in the languages of the same genealogical language group the main features of the manner of action are general. Among these are its presence (and, as an undoubted result, the lexical meaning of the verbs of this manner), perfectivation when forming the verb of inchoative manner, the absence of special indispensable lexical indicators, overlapping of the corresponding prefixal submeanings in the languages. The peripheral features that illustrate peculiarity of the systems of closely related languages are specific. Among these are the differences between the sets of formants, the differences between lexical meanings of verbs, which form verbs of inchoative manner, the frequency of secondary imperfectivation. Moreover, the used scheme of analysis and comparison can be applied to research all the manners of action in the Belarusian and Serbian.

***Key words:*** manner of action; inchoative manner of action; verb; prefix; lexical meaning; aspect; transitivity; formant.

**1. Способ действия в ряду других категорий славянского глагола.** При изучении способов действия представляется необходимым их сравнение в белорусском и сербском языках. Актуальность такого рода исследования обусловлена несколькими причинами: сравнительный анализ призван



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ